
Тыднёвік Магілёўскі

№ 26 (26)
31.10.97



У НЯДЗЕЛЮ, 2-ГА ЛІСТАПАДА, АДЗНАЧАЕЦЦА СТАРАЖЫТНАЕ БЕЛАРУСКАЕ СВЯТА ДЗЯДЫ — ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ ПРОДКАЎ. НЕКАЛЬКІ ГАДОЎ НАШАЙ НАЙНОЎШАЙ ГІСТОРЫІ ЯНО АФІЦЫЙНА ЗАХОЎВАЕЦЦА Ў ДЗЯРЖАЎНЫМ КАЛЯНДАРЫ. АДНАК АДПАЧАТКУ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ, ЯКОЕ НАПРЫКАНЦЫ ВАСЬМІДЗЕСЯТЫХ УЗНАЧАЛІЎ БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ ФРОНТ, ГЭТАЕ СВЯТА СУСТРАКАЕ АБЫЯКАВАСЦЬ, А ТОЕ І ПЕРАШКОДЫ З БОКУ ЎЛАДАЎ. ЯНЫ НЕ МОГУЦЬ ДАРАВАЦЬ ДЭМАКРАТАМ РАСКРЫЦЦЯ ТАЯМНІЦЫ КУРАПАТАЎ, ДЗЕ "СЛАЎНЫМІ ЧЭКІСТАМІ" БЫЛІ РАСТРАЛЯНЫЯ ТЫСЯЧЫ БЕЛАРУСАЎ. СВАЕ КУРАПАТЫ ЁСЦЬ, ПЭЎНА, У МНОГІХ БЕЛАРУСКІХ ГАРАДАХ. У НАШЫМ АБЛАСНЫМ ЦЭНТРЫ — ГЭТА КАР'ЕР КАЛЯ МЯСАКАМБІНАТА.

СЮДЫ ЎЖО НЕКАЛЬКІ ГАДОЎ ПРЫХОДЗЯЦЬ У ПЕРШУЮ НЯДЗЕЛЮ ЛІСТАПАДА СОТНІ (АПОШНІМ ЧАСАМ, НА ЖАЛЬ, МЕНШ) МАГІЛЁЎЦАЎ, КАБ АДДАЦЬ ДАНІНУ ПАВАГІ І ПАМЯЦІ ТЫМ, ХТО ПРАЙШОЎ ПРАЗ ТАТАЛІТАРНАЕ КАМУНІСТЫЧНАЕ ПЕКЛА. СЁЛЕТА НАШЧАДКІ АХВЯРАЎ, МЯСЦОВЫЯ ДЭМАКРАТЫ І ЎСЕ ТЫЯ, ХТО НЕ ЗАБЫЎСЯ НА ГІСТОРЫЮ, ЗБЯРУЦЦА ТУТ ЛЯ КРЫЖА ПАМЯЦІ НА ЖАЛОБНАЕ ПАМІНАННЕ А 14-Й ГАДЗІНЕ...

А ПОТЫМ ДЗЯДЫ ПРЫЙДУЦЬ У КОЖНЫ ДОМ, ДЗЕ НА ВЯЧЭРУ ЗБЯРУЦЦА РОДЗІЧЫ І СЯБРЫ, КАБ УШАНАВАЦЬ ПАМЯЦЬ УСІХ, ХТО ПАКІНУЎ НАС ПА ВОЛІ БОГА, НАКАНАВАЎШЫ ТЫМ, ХТО ЗАСТАЎСЯ НА ЗЯМЛІ, ЖЫЦЬ У КЛОПАТАХ АБ БАЦЬКАЎШЧЫНЕ І СВАІХ БЛІЗКІХ, У СЯБРОЎСТВЕ З ПРАЦАЙ, СУМЛЕННЕМ І ПРАЎДАЙ.

ПРЫХОДЗЬЦЕ ДА НАС, СВЯТЫЯ ДЗЯДЫ. ВЫ ЛЁГКА ЗНОЙДЗЕЦЕ ДАРОГУ: У КОЖНЫМ ДОМЕ Ў ГЭТЫ ВЕЧАР БУДУЦЬ ЗАПАЛЕНЫЯ СВЕЧЫ...

(Працяг тэмы на 2-й старонцы).

Магілёў. 24-е кастрычніка. Пікет-2



На тым самым месцы, каля гатэлю "Днепр", дзе два тыдні назад адбываўся пікет у абарону сацыяльна-эканамічных правоў працоўных, у мінулую пятніцу ізноў прайшло выступленне дэмакратычнай грамадскасці горада пад тымі ж сацыяльнымі лёзунгамі. Пікет быў дазволены ўладамі, а гэта значыць, што не адбылося ніякіх непрыемных канфліктаў і здарэнняў. Дэмакраты паводзілі сябе як заўсёды стрымана і дысцыплінавана. І таксама даволі паважліва паставілася да іх гэтым разам, як і падчас папярэдняга пікету, міліцыя. Толькі напачатку нястомны міліцэйскі (ці кадэбэшны?) тэлеаператар паздымаў крыху пікетчыкаў, а потым хутка сышоў. Відаць, тэлепартрэтаў дэмакратычных актывістаў набралося ў спецслужбаў за апошнія гады дастаткова — можна крыху і сэканоміць казённую стужку.

Вось і першая выснова, якую можна зрабіць: канфлікты здараюцца толькі тады, калі іх хоча ўлада, калі яна не дазваляе людзям карыстацца тымі натуральнымі правамі, якія дэкляраваны нават у апошняй беларускай канстытуцыі.

А другая выснова тая, што апошні пікет прыцягнуў увагу значна большай колькасці магілёўцаў, чым папярэдні нягледзячы на халоднае надвор'е. Удалося нават сабраць больш за паўсотні подпісаў за адмену платы за праезд у грамадскім транспарце школьнікамі, і гэта пры тым, што афармляць анкеты даводзілася пад даждом. Значна больш было і саміх удзельнікаў дэманстрацыі супраць пагаршэння жыцця. Іх колькасць павялічылася за кошт працуючай і навучэнскай моладзі, якая не горш за дарослых адчувае вастрыню сацыяльна-эканамічных праблем, што існуюць з-за некампетэнтнай палітыкі ўрада. У пікеце разам з бацькам стаяў зусім яшчэ малец, які трымаў плакат аб тым, што ён хоча не толькі звычайнай ежы, але і маразма, на якое бацька, відаць, не зарабляе не па сваёй віне.

Шпарка разыходзіліся газэты — Інфармацыйны бюлетэнь Незалежных прафсаюзаў "Рабочий" і наш "Тыднёвік". Многія ахвотна ўступалі з пікетчыкамі ў пагодныя гаворкі. Былі і тыя, быццам спецыяльна ўсе на ладным падпітку, хто не падтрымваў пікетчыкаў і наогул не разумеў, што яны тут робяць і "куды глядзіць міліцыя". Міліцыя адводзіла найбольш шумлівых абаронцаў палітыкі прэзыдэнта ў бок і настойліва раіла ім ціхенька шлэпаць дадому, пасля чаго яны зусім збітыя з панталыку хутка і знікалі.

Пікеты, апошні і папярэдні, не ўдастоілі сваёй увагай ніхто з гарадскога і абласнога начальства. Добра, што хоць "дазволілі" і не палохалі людзей, як гэта традыцыйна бывае ў нас, выклікам да месца дэмакратычных выступленняў неадэкватнай колькасці амонаўцаў.

А магчыма, што амон разам з усімі праваахоўнымі сіламі заняты на "аперацыі" па вышуку злачынцаў, якія здзейснілі ў нас нядаўні тэрарыстычны акт. Поспехаў аднак на гэтым напрамку нешта не чуваць. Не тое, што "працаваць" з дэмакратамі: вось яны, усе тут — бяры! Гэтым разам, яшчэ раз паўтарыся, абышлося.

Не хапае для поўнага шчасця толькі аднаго: змены сённяшняй беларускай палітыкі на нармальную. Пакуль гэтага не адбудзецца, усё больш шырокае кола людзей будзе пратэставаць, бо ўсё большая колькасць людзей пачынае разумець: жыць так, як жывём мы, — сорам. Тым больш такому добраму народу як наш. Тым больш у такім зручным для прыстойнага жыцця доме, якім зьяўляецца наш агульны Дом —Беларусь

Дзяніс НОВІКАЎ.

Пікеты ў абарону сацыяльна-эканамічных правоў адбыліся таксама ў шэрагу раённых цэнтраў вобласці. Іх арганізатарамі амаль паўсюдна выступілі філіі БНФ. Не спужаліся людзі выйсці з пратэстамі супраць цяперашняй палітыкі Лукашэнкі і ягонага ўраду ў Асіповічах, Слаўгарадзе, Чавусах, Быхаве.



Мы яшчэ не ў Беларусі..

Наша з вамі краіна засталася адзінай на абшарах былой камуністычнай імпэрыі, якая афіцыйна святкуе "дзень Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі". Усе сённяшнія суверэнныя дзяржавы, не выключаючы Расею, хоць і рознымі тэмпамі, аднак паслядоўна пазбаўляюцца ўсяго, што мае родавую пячатку гэтай найбольш трагічнай у гісторыі чалавецтва падзеі.

Беларусь, на чале з цяперашнім кіраўніцтвам, у "гордым" адзіноцтве дэманструе свету хваравітую настальгію па ўсяму савецкаму, захоўваючы, калі так можна сказаць, усю стылістыку і змястоўнасць былога жыцця. Каб яшчэ тое жыццё было хаця б крыху вартым чалавека...

Яно не магло быць такім, бо нарадзілася ў гвалце і адмаўленні правілаў чалавечай і боскай прыроды, маралі і прыстойнасці. Міт аб Вялікім Кастрычніку, ягоных правадырах, заваёвах і здабытках рэвалюцыі можа падтрымлівацца ў нашыя дні толькі тымі, хто ўпарта не жадае ведаць таго, што ведае ўвесь свет: Кастрычнік спыніў натуральнае развіццё чалавечай гісторыі для велізарнай колькасці народаў.

Цяпер, заплаціўшы за гэтую памылку незлічонымі ахвярамі, народы вяртаюцца туды, дзе іх гвалтоўна спынілі — да сваіх каранёў, гісторый, рэлігій, святаў, традыцый... Усе, акрамя нас.

Відаць, не будзе куды падзецца напярэдадні й 7-га лістапада ад аркестравых маршаў, святочных канцэртаў, урачыстых сходаў і паседжанняў. Аднак заўсёды можна "схавацца" у сябе саміх.

Не для таго, каб забыць. Наадварот — для таго, каб успомніць. А ўспомніўшы, — падумаць... А падумаўшы, пачаць жыць, выціскаючы з сябе кожны дзень па кроплі той атруты, што завецца "советскостью". Назапашваючы таго духоўнага багацця, што называецца беларушчынай.

Так і пакінем СССР, дзе ўсё было і засталося нам варожым і чужым. І вернемся, нарэшце, дадому.

Беларусь даўно зачакалася нас, людцы добрыя!

РЭДАКЦЫЯ.

СВЯТЫЯ ДЗЯДЫ, ПРЫЙДЗІЦЕ!

...Каб не заблудзіць у дарозе

«Дзяды»... Старажытны беларускі абрад памінання продкаў. Гісторыкі сцвярджаюць, што гэты абрад выконваўся на нашых землях яшчэ да ўвядзення хрысціянства, потым ён набыў хрысціянскае аблічча, бо ўшанаванне памёрлых добра пасуе да хрысціянскай маралі. У памяці Адама Міцкевіча пра сваё навагрудскае дзяцінства гэты дзень застаўся як адзін з найбольш уражлівых і пазней паэт прысвяціў гэтаму абраду паэму, якую так і назваў — «Дзяды».

Восеньскія «Дзяды» (або Змітравы «Дзяды», бо адзначаюцца яны ў суботу перад 8 лістапада — Змітравым днём) да нядаўніх часоў адзначаліся як абрад унутрысямейны — з паходам на могілкі, з багатай і працяглай вячэрай (працяглай, бо каб не забыць каго памянуць з сваіх памёрлых, і багатай, бо каб хапіла і ім, нябожчыкам, якія па паданнях прыходзяць на заклікі-запрашэнні ноччу на «Дзяды» праведаць сваіх).

Гісторыя ўносіць свае карэктывы і ў даўнія традыцыі. За часы сталіншчыны вынішчана столькі людзей, што некаторых ужо і некаму памянуць, бо нярэдка вынішчаліся цэлыя сем'і. Шмат дадалі Вайна вялікая і войны «маленькія» —Афганістан, В'етнам, Карэя, Сірыя, Венгрыя, Чэхаславакія (усе і пералічыць цяжка). Апошнім штуршком стала Чарнобыльская катастрофа. Так нарадзілася ідэя агульнага памінання, памінання ўсенароднага.

Першы мітынг-рэквіем (зразумела ж, не дазволены ўладамі) быў праведзены восенню 1987-га года ў Менску перад помнікам Янкі Купалы. Арганізатары атрымалі штрафы. Партыйная прэса дала партыйную ацэнку. Але ідэя ўжо жыла і хутка сталела. Наступнай восені ўжо чакалі.

«Дзяды» заставаліся сямейным абрадам, але сям'ёю, адзінаю сям'ёю станавілася ранейшае насельніцтва. «Дзяды» пераўтваралі насельніцтва ў народ, у народ, які ведае свае карані, а значыць, ведае свой шлях. Такі народ ужо не будзе пакорлівым статкам, паслухмяным волі «пастуха»...

«Дзядоў» 1988 года чакалі, як ніколі. Да іх рыхтаваліся. Рыхтаваліся і адны, і другія (так! — ужо існавалі і адны, і другія, і шмат хто ўжо свядома адносіў сябе да тых ці іншых).

Мітынг-рэквіем быў заяўлены на 14 гадзін 30 кастрычніка 1988-га года ля Маскоўскіх могілак у Менску. Гарадскія ўлады забаранілі яго правядзенне з прычыны запланаваных на гэты дзень (?!) масавых гулянняў у гонар 70-годдзя ВЛКСМ, аб чым паведамілі праз «Вячэрні Мінск». Мабыць, гэта стала першай памылкай уладаў, бо цяпер усе менчукі даведаліся пра «нейкі мітынг», хаця і без таго чуткі лёталі над сівым восеньскім горадам. Нязвыклае дагэтуль слова «мітынг» прыцягвала, бударажыла, узрушвала. І ўлады не вельмі спадзяваліся на дзейнасць сваёй забароны.

З дванаццаці гадзін быў перакрыты рух у канцы Ленінскага праспекта (цяпер — праспект Скарыны), які вядзе на Маскоўскія могілкі, станцыя метро «Усход» закрыта «па тэхнічных прычынах». Пажарныя машыны і вадамёты сцягнутыя да могілак у такой колькасці, якую раней назіраць наўрад ці можна было. Уражвала і колькасць міліцэйскіх мундзіраў — у касках, з дубінкамі, шчытамі, газавымі пісталетамі, балонамі і рупарамі, праз якія нястомна і настойліва прапаноўвалі людзям разыходзіцца, бо мітынг забаронены. Але людзі падыходзілі і падыходзілі, сотні пераўтвараліся ў тысячы. Міліцыя губляла кантроль над сітуацыяй. І міліцэйскае начальства не вытрымала — аддало загад разганяць натоўп. На галовы і спіны людзей пасыпаліся ўдары дубінкамі, некаторых хапалі, збівалі і закідалі ў «варанкі», не абыйшлося і без газавай атакі. Пацярпелі як простыя людзі, так і прысутныя дэпутаты, вядомыя пісьменнікі і журналісты (асабліва з фотаапаратамі).


Адціснутыя міліцыяй ад Маскоўскіх могілак людзі кінуліся на ўзлесак пад Курапатамі, ужо тады вядомы па артыкулу Зянона Пазьняка «Курапаты — дарога смерці». Выступленнем гэтага чалавека, якога ўдалося адбіць ад міліцыі, і пачаўся жалобны мітынг. Ён гаварыў пра ахвяры, якія панёс беларускі народ, пра абавязак жывых перад памяццю гэтых ахвяр. У іншых выступленнях выказвалася ідэя стварэння грамадскага гістарычнага таварыства па абароне памяці тых, хто загінуў у сталінскіх вязніцах і лагерах. Толькі знявечаны, сапсаваны розум мог знайсці ў тых выступленнях экстрэмізм ці нешта падобнае. Але міліцыя дабралася і на курапацкі ўзлесак. Мітынг быў прыпынены, людзей разагналі.



Праз два тыдні Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР выдаў пастанову «Аб выніках вывучэння абставін, звязаных з забаронай правядзення і спыненнем мітынга ў гор. Мінску 30 кастрычніка 1988 года», дзе адзначалася, што пракуратура не знайшла ў дзеяннях міліцыі якіх-небудзь парушэнняў заканадаўства. Гэта было як бы папярэджаннем на будучае. Але папярэджанне не спрацавала. Бо з таго часу кожны год на Змітравы «Дзяды» збіраюцца людзі на жалобныя мітынгі. Цяпер не толькі ў Менску, але ў шмат якіх іншых гарадах Беларусі.

2-га лістапада з 14-й гадзіне на традыцыйным для такой падзеі месцы каля Крыжа насупраць мясакамбіната ўжо дзевяты раз збяруцца магілёўцы, каб памянуць тых, хто загінуў і пакланіцца тым, хто, прайшоўшы кругі камуністычнага пекла, Божай ласкай дажыў да нашага дня. Праўда, мала хто з апошніх зможа прыйсці да Крыжа. Жыццё іх не песціла, і здароўе ўжо не дазваляе далёкія прагулкі ад кватэры. Але іх памяць з намі, занатаваная актывістамі магілёўскай філіі «Мартыралогу Беларусі». Такое трэба помніць, бо забытае паўтараецца.

Міхась БУЛАВАЦКІ,
старшы выкладчык
універсітэта.



ГАРТАЮЧЫ АФІЦЫЙНЫЯ ДАКУМЕНТЫ

«Да 80-годдзя Вялікага Кастрычніка»

Некалькі вечароў з цікавасцю і пачуццём, якое не ўдавалася «злавіць», каб пазначыць дакладным словам, чытаў 16-ці старонкавы дакумэнт, які гэтымі днямі быў накіраваны ва ўсе абл-гарвыканкамы з Адміністрацыі прэзыдэнта. Ён прысвечаны «80-годдзю Вялікага Кастрычніка» і мае вось такі назоў: ОРИЕНТИРОВКА ДЛЯ ГРУПП, ВЫСТУПАЮЩИХ ПЕРЕД НАСЕЛЕНИЕМ.

Па некалькіх прычынах мы не можам абмінуць сваёй увагай гэтую ідэялагічную ўказіўку, падпісаную вядомым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Іванам Іванавічам Пашкевічам. Па наіўнасці мы лічылі, што падрыхтоўка такіх адкрыта прапагандысцкіх матэрыялаў засталася ў камуністычным мінулым. Аказалася, аднак, што і сёння, як лічыць нашая ўлада, ёсць патрэба «правильно» тлумачыць грамадству жыццё і афіцыйна «рекомендовать» аднолькавыя для ўсіх адносіны да знакамітых падзей гісторыі.

Пры гэтым гаворка не вядзецца аб *фактах* гэтай гісторыі: вось яны, а вы, паважаныя суайчыннікі, думайце і рабіце высновы. Зусім не: фактаў ніякіх не падаецца і думаць таксама не трэба — Адміністрацыя стаіць на тым, што **«несмотря на нагромождение разных мифов... Октябрьская революция была закономерной вехой исторического развития, обусловленная долгими и мучительными поисками народов путей к достижению прогресса».** Чаго каштаваў гэты «прогресс» народам не толькі расейскай імперыі, але і краінаў, якія патрапілі ў выніку Другой сусветнай вайны пад экспансію камунізму, і чым ён, дарэчы, скончыўся — пра гэта ў «ориентировке» гаворыцца мімаходзь і, так бы мовіць, шырокім жэстам: **«История не знает безболезненных и бескровных революций. К сожалению, Октябрь не стал исключением в этом плане».** Але гэта, канешне, дробязі. Галоўнае, што **«революция разбудила энергию и энтузиазм трудящихся».** І ў прыватнасці, **«Беларусь, которая в послеоктябрьский период обрела государственность** *(? — ТМ)*, **в союзе с другими братскими республиками совершила рывок в создании мощного экономического потенциала, развития культуры и образования. Для белорусов, в прошлом крестьянской нации, был открыт такой доступ к знаниям, которого они не знали за всю историю своего существования»...**

Калі лічыць за вяршыню «знаний и развития культуры» фізычнае знішчэнне нацыянальнай інтэлігенцыі, здзекі над роднай мовай (на 16-ці старонках тэксту, напрыклад, беларускай мовай напісана, у прыніжальным, вядома, сэнсе толькі тры словы: «тутэйшыя свядомыя незалежнікі»), развал сістэмы нацыянальнай адукацыі, насаджэнне ў краіне раней«идейной» савецкай, а зараз бездухоўнай расейскай папсовай культуры, стварэнне глухой заслоны ад цывілізаванай Эўропы, — вось тады толькі і можна пагадзіцца з аўтарамі прапагандысцкага дапаможніка ў тым, што гэта «прогресс». Але сама Адміністрацыя, услед за прэзыдэнтам, ніколькі не сумняваецца, што так яно і ёсць, і што ўсе людзі з гэтым згодныя. Ды і чаго іншага можна чакаць ад **«в прошлом крестьянской нации»** (дзякуй хоць за тое, што «дореволюционное» існаванне беларускай нацыі, амаль што неўпрыкмет, але ўсё ж прызнаецца, і аўтары «исторического обзора» не настойваюць на тым, напрыклад, што гэта расейцы-бальшавікі далі нам азбуку і пісьменнасць)...

Не менш цікава чытаць раздзел, у якім «аналізуюцца» прычыны краху гістарычнай місыі рэвалюцыйнага пралетарыяту і наогул камуністычнай імпэрыі. Ну, зразумела, што «**не дремал и Запад**». Аднак, асноўны «**трагизм революции заключался в том, что грандиозный по своему размаху** *(вось ужо сапраўды так —ТМ)* **революционный напор вызвал к политической активности огромные люмпенизированные массы населения, привнесшие в ростки новой жизни свои предрассудки и нетерпение».**

Ці не гэта і было, спытаем ад сябе, асноўнай мэтай рэвалюцыянэраў, ці ж не правам «кожнай кухаркі» кіраваць дзяржавай і падкупнялі бальшавікі гэтыя самыя «народныя масы»? Зразумела, што ў выніку **«вчерашние недоучившиеся студенты, бывшие аптекари, несостоявшиеся ремесленники и прочая публика и возомнила себя советской элитой»**, за што аўтары сённяшняй «ориентировки» нібыта крытыкуюць творцаў рэвалюцыі і тагачаснае кіраўніцтва дзяржавы «рабочих и крестьян». Дастаецца ў дакумэнце «масам» і іх нядаўнім правадырам і за тое, што не здолелі перашкодзіць **«демократам», «народолюбцам»** (словы гэтыя, кожны паасобку, узятыя ў двукоссе аўтарамі дакумэнта), **«развалить с помощью извне великую страну».** Гэтыя ж **«радикальные реформаторы»,** на думку вучоных з Адміністрацыі, **«готовы сегодня пустить ее суверенные республики с молотка».**

Па ўсіх 16-ці старонках прапагандысцкага шэдэўра раскідана шмат іншых, самых нечаканых (хоць, зрэшты, чаму нечаканых?) тэарэтычных і навуковых заўваг і высноў. І ўсё, як і трэба ў сапраўднай прапагандзе, «увязано» з днём сённяшнім і яго актуальнымі задачамі: ёсць спасылкі на **«упорный труд хлеборобов и механизаторов»**, на **«ответственный период у животноводов»**, на **«тружеников промышленности, строительства и транспорта, которые также стремятся закрепить позитивные сдвиги...»** Гэта, аднак, не больш, чым «дежурная» актуалізацыя ідэялагічнага твора Адміністрацыі.

А галоўнае вось: **«Сильная власть —залог успешных преобразований, осуществляемых на благо народа... Сегодня остаются актуальными слова классика** *(чамусьці сарамліва не называецца ягонае прозвішча — ТМ)* **о необходимости соединения митингового демократизма с железной дисциплиной во время труда».** Напомнім чытачам, што гэтаксама лічыў не толькі гэты клясык, а і яшчэ некаторыя асобы, з якімі звязана не «все только плохое» у гісторыі — Сталін, Гітлер, Пол Пот, Мао Дзэдун.

...У свой час (аб якім, дарэчы, не шкадую) мне давялося вучыцца ў Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС. Адзін з нашых выкладчыкаў любіў жартаваць на тэму аб тым, што ён ведае шмат людзей з вышэйшай адукацыяй, але... без сярэдняй. Упэўнены, што аўтары «ориентировки» абцяжараныя нават навуковымі заслугамі і званнямі. І таму настолькі добра ведаюць «рэвалюцыйную» гісторыю, што недарэчна выдалі непажаданую «таямніцу»: бывалі часы, калі **«прочая публика мнила себя элитой»...**

Вось гэтае месца ў «ориентировке» і падказала мне раптам вызначэнне таго пачуцця, якое пры чытанні дакумэнта не было самому да канца зразумелым. А што, падумалася зараз, калі актуальны, востры і нават смелы ідэялагічны дакумэнт —гэта на самой справе прыхаваная «ідэялагічная дыверсія» супраць цяперашняй улады. Тым больш, што той жа самы клясык, а гэта ніхто іншы як Уладзімір Ільіч Ульянаў (Ленін) выказаў аднойчы і такую думку: *никто не может нанести нам, коммунистам, большего вреда, чем мы сами.*

Генадзь СУДНІК.

У якой краіне мы жывем?!

Мы жывем у такі час, калі па ўсім зямным шары рэхам аддаецца покліч свабоды і дэмакратыі. Усходняя і Цэнтральная Еўропа адхілілі таталітарныя формы кіравання, якія праіснавалі амаль паўстагоддзя. Паўночная і Паўднёвая Амэрыка зараз фактычна стварылі паўшар'е дэмакратыі. Афрыка перажывае беспрэцэдэнтную эру дэмакратычных рэформаў. Новыя дэмакратыі ўкараніліся таксама ў Азіі. Краіны —рэспублікі былога эсэсэсэр вядуць барацьбу за тое, каб замяніць камуністычныя рэжымы на новыя дэмакратычныя лады. Людзі ўсяго свету імкнуцца задаволіць свае законныя жаданні свабоды і самакіравання.

І гэта зразумела — тое, што людзі аддаюць перавагу свабодзе, а не прыгнёту. Але гэта не азначае, што дэмакратычную сістэму можна лёгка стварыць і захаваць. Усім вядома слова «дэмакратыя», але гэтае паняцце ўсё яшчэ вельмі часта няправільна разумеюць і ўжываюць, асабліва ў той час, калі таталітарныя рэжымы ці ваенныя дыктатуры спрабуюць знайсці ў народа падтрымку, выступаючы пад дэмакратычнымі лозунгамі.

На сённяшні дзень у свеце вызначаны некалькі асноўных падмуркаў дэмакратыі. Сярод іх: суверэнітэт нацыі, правы меншасцяў, гарантыі асноўных правоў і свабодаў чалавека, свабодныя і справядлівыя выбары, роўнасць усіх перад законам. Забяспечанне гэтых умоваў — своеасаблівы стандарт дэмакратычнай краіны, да якога імкнуцца людзі ўсіх кантынэнтаў.

...Аднойчы першы прэзыдэнт Беларусі сказаў: «Прошло два года, и мы поняли, в какой стране мы живем». Сапраўды, а цяпер ужо праз тры гады пасля прэзыдэнцкіх выбараў, людзі нарэшце пачалі разумець што да чаго.

Калі прааналізуем стан нашых дэмакратычных «падмуркаў», то ўбачым наступнае: суверэнітэт краіны чыста дэкаратыўны, улада належыць меншасці, а ў астатніх ніякіх правоў па сутнасці няма, дзяржава не можа гарантаваць нават права на жыццё. Свабодныя выбары пры цяперашняй уладзе ніколі не адбудуцца, роўнасці перад законам няма: кожнага чалавека могуць у любы момант кінуць за краты.

У Беларусі — не дэмакратычныя, а таталітарныя парадкі! Такая палітычная сістэма спрыяе пасыўнасці і апатыі ў грамадскіх настроях. Рэжым імкнецца сфармаваць пакорлівае і паслухмянае «народонаселение». Мы не ідзем за ўсім цывілізаваным светам. Мы, як у 1941-м, «в кольце врагов».

Мы разумеем, у якой краіне жывем. І мы пачынаем разумець: ад нас залежыць як доўга гэта працягнецца.

Аляксандр БУРАКОЎ,
старшыня гарадской
арганізацыі Маладзёжнага
хрысціянска-сацыяльнага
саюза.

А ўсяго-та і адлегласці, што 700 км

Часта ў сродках масавай інфармацыі можна прачытаць аб тым, як жывуць людзі ў Амерыцы, Галяндыі альбо Нямеччыне. Аднак пра нашых найбліжэйшых суседзяў у нас амаль нічога не пішуць.

Днямі я некалькі гадзінаў правёў у сталіцы Польскай дзяржавы —Варшаве, і сваімі меркаваннямі хачу падзяліцца з чытачамі ТМ. Пачну ад памежнага пераходу ў Берасьці.

Недзе а палове адзінаццатай вечара цягнік «Масква-Варшава» прыбыў на памежную станцыю Брэст-Цэнтральны. Хутка дзверы купэ расчыніліся і я ўбачыў супрацоўніка беларускай мытні. Не вітаючыся ён адразу запатрабаваў:

— Декларацию, багаж на досмотр!

І пачаў заглядаць пад канапы. Потым схапіў маю дэкларацыю й пачаў бегла яе чытаць, пасля чаго спытаўся:

— Что это за белиберда?!

— Што вы маеце на ўвазе? — не зразумеў я.

— Каким языком вы это написали!

— Дэкларацыя запоўнена на беларускай мове.

— Русского, что ли, не знаешь?

— Не, — адказаў я.

— Ладно, рюкзак покажи.

Я адчыніў заплечнік і пачаў выкладаць рэчы на канапу. Тут ён убачыў між іншых рэчаў кашульку з выявай Пагоні, і сказаў:

— Это вывозить нельзя.

— Чаму?

— Потому что это запрещено таможенным законодательством.

— Так што, вы зараз канфіскуеце гэта?

Адказу на сваё пытанне я не атрымаў, замест яго мытнік паставіў на дэкларацыі пячатку і гэтак жа не развітваючыся выйшаў. Пасля яго ў купэ увайшоў памежнік, моўчкі забраў пашпарт і некуды яго знёс, а нашыя вагоны тымчасам павезлі на перасоўку колаў. Пашпарт аддалі толькі пасля перасоўкі. Уся працэдура памежнага й мытнага кантролю заняла дзве з паловай гадзіны.

На польскім боку ў купэ зайшоў адзін памежнік. Прывітаўшыся, ён паставіў у пашпарце пячатку і, развітаўшыся, сышоў. Больш мяне ніхто не турбаваў. Я прыехаў у Эўропу.

У сталіцы Польшчы я быў нараніцы. Яшчэ з вокнаў цягніка я ўбачыў высачэнны вежавік — гатэль «Марыётт». Выйшаўшы з вагону і падняўшыся з пэрону (у Варшаве чыгуначныя пэроны знаходзяцца пад зямлёю), я апынуўся на вакзале. У мяне ў запасе яшчэ быў час, і я вырашыў зрабіць невялічкі праменад.

Перад «Марыётам» кіпела яшчэ начное жыццё. Тут было шмат людзей. Свяціліся рэклямы рэстарацыяў і казіно. Але мае кішэні не былі абцяжараныя далярамі, і таму я пашыбаваў далей.

Жыццё ў Варшаве не прыпынялася ні на хвіліну. Самае цікавае, што за чатыры гадзіны майго праменаду я не сустрэў ніводнага паліцэйскага. У чым жа справа? Чаму людзі ўсяго толькі за 700 км ад нас жывуць зусім інакш, нашмат лепей, свабодна і добра? Раней жа Польшча была такой самай краінай сацыялістычнага лягеру, як і Беларусь.

Адказаў тут шмат. Па-першае, Польшча інтэгруецца ў Эўропу, а мы — не. Польскія межы адчыненыя для бізнэсу і турызму, а не для злачыннасці. Палякі шануюць сваю мову, сымбалі дзяржавы, культуру, а мы да ўсяго гэтага ставімся абыякава. Палякі абудзіліся ад камуністычнага сну й пачалі працаваць, а нашыя ўлады цягнуць народ назад у мінулае, кажучы, што толькі гэта нас уратуе. Гэта ўратуе іх, а не нас.

Беларусь — багатая краіна, наш народ працавіты, але калі сёння не абудзіць яго, нашая нацыя і прыгожая краіна загінуць.

Сяржук ГІРКІН.



ЗАЯВА

ПРО ПРИНЦИПИ ВЗАЄМОВІДНОСИН МІЖ УКРАЇНСЬКОЮ ТА БІЛОРУСЬКОЮ ПРАВОСЛАВНИМИ ЦЕРКВАМИ

В ім'я Отця і Сина і Святого Духа!

[illegible]

Нехай благодать Божа завжди перебуває зі всіма нами!

Амінь!

ПАТРІАРХ КИЇВСЬКИЙ І ВСІЄЇ РУСИ - УКРАЇНИ

МИТРОПОЛИТ, ПЕРШОІЄРАРХ БІЛОРУСЬКОЇ АВТОКЕФАЛЬНОЇ ПРАВОСЛАВНОЇ ЦЕРКВИ

«9» вересня 1997 р.Б.

Як мы ўжо паведамлялі раней, Першагерарх Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы Я.М.Мітрапаліт Ізяслаў з 1-га па 10-га верасня г.г. наведаў Кіеў і іншыя месты Украіны, куды ён быў запрошаны Яго Свяцействам Філарэтам, Патрыярхам Кіеўскім і ўсяе Русі-Украіны Украінскай Праваслаўнай Царквы.

Па выніках сустрэчы Мітрапаліт Ізяслаў і Патрыярх Філарэт прынялі сумесную «Заяву аб прынцыпах узаемных дачыненняў паміж Украінскай ды Беларускаю Праваслаўнымі Цэрквамі». У дапаўненне да заявы былі зацверджаныя й канкрэтныя крокі і спосабы дапамогі з боку Кіеўскага Патрыярхату УПЦ узнавіць існаванне БАПЦ на Беларусі. Вось некаторыя вытрымкі з ліста, у якім Кансысторыя БАПЦ інфармавала ТЫДНЁВІК аб гэтай падзеі.

«...Мэтай падарожжа было наладжаньне бліжэйшае лучнасьці й цясьнейшага супрацоўніцтва паміж БАПЦ і сястрыною Праваслаўнаю Царквою суседняга Украінскага Народу, зь якою нас родніць гістарычная мінуўшчына і аднолькавыя ўмовы ў змаганьні супраць маскоўскага царкоўнага й дзяржаўнага імпэрыялізму.

З Божае Ласкі сустрэчы й гутаркі падчас падарожжа зь Яго Сьвяцействам Патрыярхам Філарэтам, а таксама зь іншымі ерархамі Кіеўскага Патрыярхату УПЦ выявілі іхнюю шчырую любоў да Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы ды гатовасьць усімі магчымымі спосабамі памагчы ўзнавіць Ейнае існаваньне на Беларусі.

Гэтая гістарычнае вагі падзея ў нашым царкоўным жыцьці паказвае, што Божае прыняньне з намі ды накладае на кожнага з нас —беларусаў абавязак узмоцненай дзейнасьціў і ахвярнасьцяў спрычыніцца да ўзнаўленьня Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы на Бацькаўшчыне, а праз гэта й адбудаваць непарушны духовы фундамант Беларускае Дзяржаўнасьці.

Сьцеражы, Божа, Беларускі Край!».

Эміграцыя ў ЗША

Прыём заяваў на ўдзел у штогадовай латарэі, устаноўленай іміграцыйным законам ЗША, на якой можна выйграць візу на ўезд і пасяленне на амерыканскай зямлі, сёлета праводзіцца ад 24-га кастрычніка да 24-га лістапада 1997 году.

Права запісацца на латарэю й выйграўшы візу прыехаць у ЗША маюць усе народжаныя ў Беларусі і ў краінах СНД, калі маюць сярэднюю асвету, або два гады практыкі ў вызначанай Дэпартамэнтам Працы ЗША прафесіі.

Заяву трэба пісаць машынкай, або ад рукі друкаванымі ангельскімі літарамі (лацінкай) на аркушы (лісце) звычайнае паперы, падаючы дадзеныя, як паказана ніжэй.

1. Прозвішча, імя й другое імя, калі яно ёсць, як напр. у каталёгу (не пісаць імя па бацьку). Прозвішча абавязкова трэба падкрэсліць.

2. Дата й месца нараджэння (дзень, месяц, год і горад/сяло, вобласць, край (рэспубліка).

3. Імёны, даты й месцы нараджэння жонкі (мужа) й малодшых за 21 год нежанатых (незамужных) дзяцей.

4. Поўны й дакладны адрас таго, хто падае заяву (куды павінен ісці адказ). Нумар тэлефону пажаданы.

5. Родны край (native country), калі іншы ад краю нараджэння (country of birth). Тады, народжаным за межамі Беларусі, каб патрапіць у лік эмігрантаў (квоту) з Беларусі, можна падаць беларускае грамадзянства (Belarusian citizenship), калі яно ёсць, або паходжанне (Belarusian origin). Хто народжаны й жыве ў Беларусі хай нячога нічога. Беларусы, што нарадзіліся й жывуць у краях за межамі Беларусі, павінны падаваць тыя краі.

6. Заяву трэба падпісаць звычайным подпісам.

7. Да гэтак выпаўненага ліста трэба прымацаваць празрыстай прылейнай стужкай (прышпількі й шпількі не дазваляюцца) сваю нядаўнюю фатаграфію 37 мм/37 мм, на другім баку якой друкаванымі ангельскімі літарамі напісаць прозвішча й імя.

Выпаўненую заяву трэба высылаць звычайным (не заказным) лістом у канверце ад 15 да 25 см у даўжыню і ад 9 да 11 см у шырыню, заадрасаваўшы яго ў верхнім левым куце таксама ангельскімі літарамі гэтак:

Край нараджэння (Belarus або іншы).

Прозвішча й імя.

Вуліца, нумар дому й кватэры.

Горад, вобласць, паштовы код.

Край (Belarus або іншы).

Ніжэй, калі пасылаецца з Беларусі або з Эўропы, пасярэдзіне заадрасаваць:

DV 99 PROGRAM
NATIONAL VISA CENTER
PORTSMOUTH NH 00212 USA

Заяву выслаць поштай, найлепш паветранай, каб дайшла нараней 24-га кастрычніка й не пазней 24-га лістапада 1997-га году, інакш яна будзе адкінутая.

Толькі тыя, што выйграюць візы, будуць аб гэтым паведамленыя й тады атрымаюць далейшыя інструкцыі ў справе выезду.

Іхныя жонкі (мужы) й непаўналетнія дзеці будуць таксама мець права на атрыманне візаў.

Трэба таксама мець на ўвазе, што пачаткі жыцця ў ЗША могуць быць нялёгкія й таму адважвацца выязджаць з Беларусі ёсць сэнс толькі тым суродзічам, што ўпэўненыя ў сваіх сілах у кожных абставінах.

Інфармацыя падрыхтаваная
Іміграцыйным Аддзелам
Кансысторыі
БАПЦ

Динамика и противоречия потребительского рынка Беларуси

Владимир Кулаженко, доктор экономических наук, профессор

В хозяйственной практике используется ряд показателей, характеризующих состояние экономики: ее рост или кризисное падение, равновесие или наличие диспропорций. Однако существует система показателей, дающая представление о том, что имеют от экономики и ее состояния непосредственные работники и все население. Речь идет о потребительском рынке.

Потребительский рынок, как и вся хозяйственная деятельность в переходной экономике Республики Беларусь, формируется и действует при таких противоречиях и несоответствиях, что весьма сложно оценивать его реальное состояние. Тем не менее некоторые данные многое проясняют.

В пределах 1-го процента сократился товарооборот в системе потребительской кооперации. И сколько бы властные структуры страны ни занимались вопросами улучшения торговли на селе, эту проблему решить вряд ли удастся, поскольку покупательная способность сельского населения крайне низка. Заработная плата в сельском хозяйстве двое ниже, чем, например, в промышленности. Кроме того, на колхозы и совхозы приходится более половины общей задолженности государства по заработной плате. На конец августа эта сумма составляла 303,9 миллиарда рублей.

Представление о реальном состоянии потребительского рынка дает анализ реализации основных продовольственных товаров. Так, за январь-август населению страны продано 308,3 тысячи тонн мяса и мясопродуктов. Однако объективность этих данных можно оспорить, поскольку государственные закупки скота и птицы в хозяйствах сократилось по сравнению с прошлым годом на 3 процента. Согласно статистическим данным, на городских рынках за 8 месяцев продано сельскохозяйственной продукции на 1825 миллиардов рублей — на 3,6 процента меньше, чем за соответствующий период прошлого года. Это свидетельствует о том, что индивидуальное производство, да и общественное тоже, не располагает достаточными резервами товарной продукции. При этом официальная статистика выводит рост продажи мяса по всем каналам реализации на 7 процентов.

Иная ситуация с продажей водки и вина. 13,4 миллиона декалитров продано этого товара за 8 месяцев текущего года. Рост товарооборота винa-водочных изделий составил приблизительно 40 процентов. Несомненно, что за счет такого успеха повысились и средние показатели роста товарооборота на потребительском рынке.

Вероятно, в связи с тем, что президент А.Лукашенко не смог посетить Калининградскую область, сократилась на 17 процентов продажа рыбы. Правда, рыбопродукты в Беларуси — товар почти полностью завозной, перебои в торговле ими могут возникать по разным причинам. Но вот причины сокращения реализации на 4-7 процентов цельномолочной продукции, картофеля и овощей на городских рынках необходимо искать внутри страны.

Нет заметного улучшения на рынке платных услуг и в сфере общественного питания. Если проанализировать скачки в товарообороте общественного питания по месяцам, то окажется, что в августе общественное питание не достигло уровня товарооборота декабря 1996-го года. Объясняется это снижением потребительского спроса, обусловленного ростом цен.

Неутешительна ситуация и на рынке непродовольственных товаров. За январь-август текущего года их реализовано на 11 процентов больше, чем за такой же прошлогодний период. Но объём производства, например, лёгкой промышленности, возрос за этот же период на 29,2 процента. В этом нет ничего неожиданного, поскольку цены на продукцию высоки, а население не имеет средств на их приобретение. К тому же отечественная легкая промышленность не достигла необходимых стандартов качества изделий. Как следствие, ежемесячный рост на 9-12 процентов товарных запасов нереализованной продукции в торговле. На 1-е января их объем составлял 5,6 триллиона рублей, а на 1-е сентября — уже 8,6 триллиона. На складах предприятий легкой промышленности скопилось невостребованной продукции на 1,4 триллиона рублей.



Состояние потребительского рынка в стране в решающей мере определяется также уровнем цен и практикой ценообразования. В августе нынешнего года цены на важнейшие продукты питания были значительно выше, чем год назад. На хлеб и хлебобулочные изделия они повысились на 72%, муку пшеничную — на 68,1%, крупы — на 87, яйца — на 65,6, на мясо и мясопродукты — на 50 процентов.

Достаточно высокими темпами растут цены на непродовольственные товары. По сравнению с декабрем 1996-го года, цены на велосипеды выросли в 2 раза, на табачные изделия — в 1,8, на бытовые электроприборы — в 1,7, легковые автомобили, бензин, строительные материалы — в 1,6 раза, медикаменты, печатные издания, хозяйственное и туалетное мыло — на 42-47 процентов.

Что же мешает нормально функционировать потребительскому рынку Беларуси? На этот вопрос можно ответить просто — кризис экономики в целом и практика хозяйствования.

БелаПАН.

МАГІЛЁЎ: ДАЎНІНА І СУЧАСНАСЦЬ

ГІСТАРЫЧНЫ АГЛЯД І.МАРЗАЛЮКА

Што нам вядома пра Магілёў XIV-XV ст.ст.?



На працягу XIV-XV ст.ст. адбыліся істотныя змены ў развіцці Магілёва, выкліканыя яго новым адміністрацыйным статусам і ростам асвоенай тэрыторыі вакол замчышча. Адразу падкрэслім яшчэ раз той факт, што культурны слой XIV ст. на пасадах у Магілёве адсутнічае. Гэта дазваляе казаць аб спыненні жыцця на паселішчах XII-XIII ст.ст. Што тычыцца замка, то і ў той перыяд часу жыццё на ім захоўвалася — аб гэтым сведчаць знаходкі на яго тэрыторыі фрагментаў керамікі другой паловы XIII-XIV ст.ст. У гэты час нават былі паноўлены замкавыя ўмацаванні. Аднак дрэнная захаванасць культурнага слоя XIV-XVIII ст.ст. на тэрыторыі замка (ён цалкам перааадкладзены) таксама не дазваляе меркаваць аб інтэнсіўнасці жыцця на гарадзішчы ў XIV ст.

Найстаражытнейшай пісьмовай крыніцай, у якой згадваецца горад, зьяўляецца "Список русских городов дальних и ближних", які быў змешчаны ў археаграфічным спісе Наўгародскага летапіса малодшага ізвода. Магілёў аднесены да гарадоў Кіеўскіх: "...А се Киевские гроди... Чечерск, Тетерин, Попова Гора, Пропошеск, Гомин, Речица, Могилев, Быхов, Лучин, Рогачев". Першым навукоўцам, які грунтоўна прааналізаваў "Спіс", быў М.Ціхамiраў. Ён лічыў часам узнікнення помніка храналагічны прамежак паміж 1387-м і 1392-м г.г. Пасля Ціхамірава аналізу крыніцы прысвяцілі шмат увагі А.Насонаў і Б.Рыбакоў. Насонаў выказаў меркаванне, што "Список..." быў складзены ў канцылярыі мітрапаліта кіуескага Кіпрыяна, з гэтай высновай сёння пагаджаюцца ўсе астатнія даследчыкі помніка. Б.Рыбакоў паказаў, што датаванне асобных груп гарадоў мае разыходжанне. Спіс Залескіх гарадоў быў складзены пасля 1387-га г., Смаленскі — раней 1386-га, а Кіеўскі (найбольш цікавы для нас) — не раней 1394-га. Даследчык лічыў, што "Список..." зьяўляецца пералікам тых гарадоў і старажытных маленькіх гарадкоў, якія былі павінны плаціць нейкую даніну мітрапаліту. Для нас вельмі істотны той момант, што ў разуменні мітрапалічай канцылярыі пералічаныя "грады" зьяўляюцца цэнтрамі прыходаў.

Гэта дазваляе выказаць меркаванне, што ў канцы XIV ст. "град Могилев" мог зьяўляцца цэнтрам царкоўнага прыхода. У гэты час ён ужо быў адміністрацыйным асяродкам воласці і належыў каралеве Ядвізе.

Успамін аб горадзе сустракаецца ў спісе замкаў і земляў вялікага князя Свідрыгайлы. Крыніца датавана 1431-м г. 11-га сакавіка 1447-га года была выдадзена грамата Казіміра Ягайлавіча магілёўскім месцічам, што падмацоўвала грамату вялікага князя Вітаўта на вызваленне магілёўскіх баяр Ільінічаў ад цягла. Дакументы, адрасаваныя княскаму намесніку, "старцам" і "мужам", дазваляюць скласці пэўнае ўяўленне аб сістэме арганізацыі ўлады ў Магілёве XV ст. Магілёўскае намесніцтва згадваецца і 30-га лістапада 1481-га года ў памятным запісу аб раздачы вялікім князем Казімірам намесніцтваў у Троках.

Вельмі цікавым дакументам зьяўляецца і бязмытны ліст Казіміра Ягайлавіча менскаму месцічу Лукашу Цярэшкавічу ад 4-га сакавіка 1448-га года. Сярод гарадоў, дзе дазволена бязмытна гандляваць Цярэшкавічу, пазначаны і Магілёў. Гэта інфармацыя канстатуе той факт, што ў XV ст. Магілёў быў гандлёвым асяродкам, меў сваю мытню.

8-м сакавіка 1488-га года датавана грамата вялікага князя Казіміра магілёўскаму намесніку і старцам аб вызваленні баяр Ільінічаў ад падвод і наданні ім "Семенческой земли".

26-га чэрвеня 1496-га года горад згадваецца сярод валасных асяродкаў, якія былі павінны "Киева оправдяти". З Магілёва было паслана "девяносто человеков". Аб магілёўскіх купцах мы даведваемся са скаргі 8-мі "мужей могилевцев", перададзенай вялікаму князю 15-га студзеня 1498-га года на "свою братью данников" і на іншых "товарышов", якія кралі гаспадарскі воск.

Археалагічныя матэрыялы (кераміка), якія можна аднесці да другой паловы XII-XIV ст.ст., сустракаліся толькі на тэрыторыі магілёўскага замчышча. У XV ст. назіраецца рост гарадской тэрыторыі, пачынае фарміравацца топаструктура горада. Адкладанні гэтага часу прасочаны на тэрыторыі Гандлёвай плошчы (сёння Савецкая), Нагорскім, невялікай частцы Шклоўскага (сучасная тэрыторыя Тэатральнага сквера), Заднепроўскага і Пакроўскага пасадаў. Культурны слой гэтага часу пераважна шэрага колеру, насычаны косткамі, вуглём, драўнінай, мае невялікую таўшчыню (0,1-0,5 м), што сведчыць аб малаінтэнсіўным жыцці і рэдкай забудове.

Ужываючы ў дачыненні да Магілёва XV ст. тэрмін "горад", неабходна зрабіць некалькі істотных заўваг. Па-першае, горадам Магілёў таго часу можна назваць толькі ў тым сэнсе, што ў гэты перыяд пачынае складацца топаструктура, характэрная для гарадскога комплекса: замак — гандлёвая плошча — пасады. Мы не можам казаць аб інтэнсіўным развіцці гандлёвай і рамеснай дзейнасці ў Магілёве таго часу. Пераважная большасць знаходак прадстаўлена фрагментамі керамікі, знойдзены адзінкавыя маскоўскія, цвярскія і наўгародскія манеты-пулы ды адна касцяная капавушка.

Таму найбольш слушна казаць, што ў XV ст. пачынае фарміравацца гарадскі комплекс, а яго канчатковае афармленне прыпадае на XVI стагоддзе.

ЗДАРОЎЕ Ў ВАШЫМ ДОМЕ

Аптэка на кухні

Любая кухня можа стаць нядрэннай аптэкай, толькі не ўсе ведаюць і памятаюць аб гэтым. І вось мы вырашылі нагадаць сваім чытачам аб добрых, але ў асноўным забытых рэцэптах лекавання нашых продкаў. Тым больш, што яны не патрабуюць вялікіх затрат, і даволі даступныя кожнаму. А рэцэпты гэтыя мы адшукалі ў часопісе "Русскій міръ", які выходзіў яшчэ ў далёкія дарэвалюцыйныя часы. Спадзяёмся, што парады нашых бабуль і дзядуль дапамогуць у многім і вам.

Так, напрыклад, у вас ці ў некага з вашых знаёмых забалела галава. Можна, канешне, праглынуць таблетку анальгіну ці панадолу. Але паспрабуйце выкарыстаць добры старадаўні спосаб лячэння: прыкладзіце да ілба ці да скроняў лісты капусты — звычайна больш хутка праходзіць.

Калі ж у вас баляць дзясны, карысна часцей жаваць кіслую капусту.

У кожнай гаспадыні заўсёды пад рукой бульба. Продкі сцвярджаюць, што сок сырой бульбы лечыць захворванні страўніка. Цёртую бульбу прыкладваюць да апёкаў.

Вядома, што часнок і цыбуля —надзейныя сродкі для лячэння і прафілактыкі так званых прастудных захворванняў. Акрамя таго, свежым сокам цыбулі зводзяць барадаўкі, лечаць раны, умацоўваюць валасы. Пры жаванні цыбулі і часнаку ротавая поласць ачышчаецца ад усіх мікробаў за некалькі хвілін (дарэчы, па сведчанні часопіса "Русскій міръ", такі ж эфект дасягаецца пры жаванні антонаўскіх яблыкаў).

Пры астматычным бранхіце добры вынік дае сок рэдзькі, які прымаюць па сталовай лыжцы тры разы на дзень. Ён таксама добра дапамагае пры захворванні жоўцевага пульхіру, перашкаджае ўтварэнню камянёў.

Шматлікія гаспадыні выкарыстоўваюць у прыгатаванні кансерваў і іншых страваў яблычны воцат. Майце на ўвазе: ён садзейнічае нармалізацыі абмену рэчываў, умацоўвае вены, супакойвае нервовую сістэму.

Самае карыснае малако — казінае. Яно нармалізуе абмен рэчываў, вылечвае многія захворванні скуры (асабліва ксарыяз) пры ўнутраным і вонкавым ужыванні. Акрамя таго, казінае малако вельмі эфектыўнае пры паносах у дзяцей.

Лімон прымаюць пры атэрасклерозе, захворваннях страўніка, мачакаменай хваробе.

Морква і яе сок вельмі эфектыўны пры захворваннях скуры і вачэй.

Замест розных бальзамаў і крэмаў нашы продкі ўмацоўвалі свае валасы і пазногці сокам агурка.

А цяпер некалькі словаў аб бураках. Бурачны сок паляпшае кроў, лечыць гіпертанію, малакроўе, умацоўвае нервовую сістэму, паляпшае сон. Усім людзям старэй за 50 год рэкамендуецца з'ядаць штодзённа па два вараныя буракі сярэдніх памераў.

Пры прастудзе самае надзейнае лякарства, наколькі гэта ні здасца дзіўным — вада. Калі чалавек пакутуе бранхітам, трэба з раніцы да вечара піць гарачую вадкасць —кожныя 20 хвілін па 3-4 глыткі. У першай палове дня гэта можа быць звычайная гарбата, а пасля абеду —разведзенае вадой малако. Дарэчы, пры той жа прастудзе ці грыпу адным з самых дзейсных метадаў зьяўляецца капустная дыета па 1-2 дні. У гэтыя дні нельга ўжываць нічога, акрамя свежай белакачаннай капусты. Яе можна есці ў любой колькасці, колькі хочацца.

Такім чынам, добрага вам здароўя і... прыемнага апетыту.

Падрыхтаваў
Юрась ДЗЕГЦЯРОЎ.

Перакладзіце на беларускую мову

Па гарызанталі: 7. Старая дева. 8. Невестка (жена брата). 9. Багульник. 10. Фата. 11. Молва. 15. Крыжовник. 18. Хворостина. 19. Звездопад. 20. Бык (производитель). 21. Зачет. 24. Знакомец. 26. Куча камней. 27. Мостки. 31. Путаница. 33. Ребро. 34. Волынщик. 35. Юг. 36. Недотепа.

Па вертыкалі: 1. Преимущество. 2. Бечевка. 3. Охапка. 4. Подруга невесты в свадебном обряде. 5. Забавник. 6. Клевер. 12. Боров (у дымохода). 13. Ощипывание. 14. Окрестность. 16. Предание. 17. Закал. 22. Деревня. 23. Градобитие. 25. Кожанка. 28. Вранье. 29. Знаток. 30. Глыба, кусок. 32. Шуба.

Рэдактар Генадзь СУДНІК





Інфармацыйна-аналітычная газета, заснаваная Магілёўскай гарадской асацыяцыяй "КОЛА СЯБРОЎ".

Зарэгістравана ў Дзяржкамітэце Рэспублікі Беларусь па друку за № 831.

Газета выходзіць па пятніцах, пераважна на беларускай мове..





АДРАС РЭДАКЦЫІ: 212030 г. Магілёў, вул. Першамайская, 6-22.



ТЭЛЕФОНЫ: 31-04-15, 22-97-82

Газета набрана і надрукавана афсетным спосабам у Магілёўскай абласной друкарні імя Я.М.Свярдлова. Зак. 26. Тыраж 2100 асобнікаў.